# Быць на ўзроўні часу



**Краіна завяршае чацвёрты год дзесятай пяцігодкі, пяцігодкі эфектыўнасці і якасці. Дастойны ўклад у агульную справу ўносіць і наш універсітэт, яго прафсаюзная арганізацыя.**

**Нядаўна ва універсітэце адбылася справаздачна-выбарная прафсаюзная канферэнцыя, на якой былі падведзены вынікі работы за 1977-79 навучальныя гады.**

**Сёння мы прапануем нашым чытачам справаздачны даклад (у скарачэнні), з якім выступіў старшыня прафкома БДУ імя У. І. Леніна М. М. Дрозд.**

ДЗЕЙНАСЦЬ прафсаюзнага камітэта за справаздачны перыяд значна актывізавалася, павысіўся яго аўтарытэт, узровень кіраўніцтва работай прафсаюзных арганізацый факультэтаў і прафгруп, узрос уплыў прафсаюзнай арганізацыі ў рашэнні галоўнай задачы вышэйшай школы — падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Усе прафбюро факультэтаў працуюць на правах прафкома. Гэта садзейнічае развіццю іх ініцыятывы і павышэнню адказнасці ў рашэнні галоўных пытанняў. Выкарыстоўваючы гэтыя правы, прафбюро факультэтаў самастойна размяркоўвалі пуцёўкі ў санаторыі, дамы адпачынку, прафілакторый, спартыўна-аздараўленчы лагер універсітэта, месцы ў інтэрнаце, аказвалі матэрыяльную дапамогу студэнтам, якія маюць патрэбу, фінансавалі розныя культурна-масавыя мерапрыемствы. Вялікую ролю ў актывізацыі дзейнасці факультэцкіх прафсаюзных арганізацый адыграў і прадаўжае адыгрываць агляд-конкурс, які праводзіўся прафкомам на лепшы факультэт па прафсаюзнай рабоце. За 1977-78 навучальны год пераможцай выйшла прафсаюзная арганізацыя юрыдычнага факультэта. У гэтым навучальным годзе, па папярэдніх падліках, першае месца займае прафсаюзная арганізацыя механіка-матэматычнага факультэта. Гэты факультэт з'явіўся пераможцам і ў аглядзе-конкурсе на лепшае афармленне пакоя прафбюро.

**Вялікае значэнне ў актывізацыі прафсаюзнай работы адыгрывае створаная пры прафкоме універсітэта школа прафсаюзнага актыву, якая здзяйсняла цэнтралізаванае кіраўніцтва вучобай прафактыву.**

Акрамя гэтага, на кожным факультэце сістэматычна праводзіліся семінары прафгрупоргаў, дзе выступалі вызваленыя работнікі прафкома, найбольш падрыхтаваныя члены прафкома і прафбюро факультэтаў. Вялікае месца ў навучанні прафгрупоргаў займае зверка прафсаюзных дакументаў, якая праводзіцца штогод. Мэта гэтай зверкі — не толькі навесці парадак у прафсаюзнай гаспадарцы групы, але і выкарыстанне такой магчымасці, як індывідуальная гутарка з прафгрупоргам аб яго рабоце.

Усе гэтыя мерапрыемствы садзейнічалі актывізацыі дзейнасці нашага прафсаюзнага актыву. Аднак і ў гэтай рабоце мы маем сур'ёзныя промахі і цяжкасці.

Перш за ўсё не ўсе катэгорыі прафсаюзнага актыву ахоплены вучобай. Акрамя гэтага, шэраг прафсаюзных актывістаў фармальна выконваюць свае абавязкі. Адны — не маючы вопыту работы, іншыя — па выпадковасці выбару ў прафактыў.

На наш погляд, новаму саставу прафкома ў гэтым годзе трэба арганізаваць вучобу прафактыву пры факультэце грамадскіх прафесій. Гэта дазволіць падрыхтаваць студэнтаў да прафсаюзнай работы. У той жа час і ФГП будзе мець магчымасць рэалізаваць вынікі сваёй работы на практыцы.

**Садзейнічаючы рэктарату ў рашэнні галоўнай задачы, прафсаюзная арганізацыя ўнесла пэўны ўклад у падрыхтоўку сучасных спецыялістаў. Перш за ўсё хочацца адзначыць той факт, што большасць нашых прафсаюзных актывістаў вучацца толькі на выдатна і добра, з'яўляюцца прыкладам у вучобе, працы, дысцыпліне, увесь час клапоцяцца аб адстаючых.**



Вучэбна-вытворчыя камісіі прафбюро факультэтаў і прафкома пастаянна прымалі актыўны ўдзел у распрацоўцы прапаноў па ўдасканаленню арганізацыі вучэбнага працэсу, стварэнню студэнтам неабходных умоў для паспяховага авалодання ведамі, рацыянальнаму выкарыстанню вучэбнага і вольнага часу.

Найбольш змястоўнай у гэтым напрамку з'явілася работа прафсаюзных арганізацый факультэта журналістыкі, юрыдычнага і гістарычнага факультэтаў.

Пытанні вучобы пастаянна абмяркоўваюцца на пасяджэннях прафбюро ў прафсаюзных групах. На механіка-матэматычным факультэце ўжо некалькі гадоў працуе савет выдатнікаў. Вялікая работа праводзіцца з першакурснікамі. Для іх створаны спецыяльны лекторый «Вучыся вучыцца», ёсць грамадскія куратары-старшакурснікі, якія ўвесь час працуюць з першакурснікамі. На гістарычным і філалагічным факультэтах добра пастаўлена работа з адстаючымі студэнтамі. Студэнтаў, якія маюць запазычанасці, як правіла, выклікаюць на пасяджэнні вучэбна-вытворчай камісіі, дзе высвятляюцца прычыны запазычанасці, замацоўваюцца студэнты-выдатнікі за адстаючымі. Рэгулярна праводзяцца злёты выдатнікаў вучобы, маляўніча аформлены стэнды выдатнікаў.

**Недастатковая работа асобных прафсаюзных арганізацый прывяла да таго, што за непаспяховасць было выключана ў 1978-79 навучальным годзе 106 студэнтаў. Прычым асноўная маса — студэнты 1, 2 і 3 курсаў (амаль 90 працэнтаў) атрымала нездавальняючыя адзнакі.**

Разам з тым, шмат недахопаў ёсць яшчэ і ў арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва на лепшую вучэбную групу і ва ўсёй вучэбна-вытворчай рабоце. Па-першае, хаця вынікі агляду-конкурсу падводзяцца, пераможцы не заўсёды ўзнагароджваюцца. Па-другое, спаборніцтва на лепшую групу абавязвае прафсаюзны актыў рэгулярна падводзіць вынікі. Для гэтага ў нас ёсць усе магчымасці. У дэканатах вядуцца экраны бягучай паспяховасці. Застаецца толькі аналізаваць гэтыя раздзелы спаборніцтваў. Аднак не ўсюды гэта робіцца.

Недастаткова займаліся прафком і прафбюро факультэтаў пытаннямі вывучэння бюджэту часу студэнтаў, паляпшэння работы бібліятэк, чытальных залаў, метадычных кабінетаў, рабочых пакояў у інтэрнатах, правільнага размеркавання падручнікаў і дапаможнікаў сярод студэнтаў. Усё гэта, вядома, адбівалася на паспяховасці студэнтаў. Не ў меншай меры прычынай нізкай паспяховасці з'яўляецца перагрузка студэнтаў вучэбнымі заняткамі.

**Камуністычнае выхаванне студэнцкай моладзі не абмяжоўваецца лекцыямі і заняткамі. Яно арганічна дапаўняецца вялікай ідэйна-выхаваўчай работай у пазавучэбны час. Тут вялікае поле дзейнасці для прафсаюзнай арганізацыі. Гэта — вечары-сустрэчы пакаленняў, сустрэчы з ветэранамі партыі, Вялікай Айчыннай вайны, вечары працоўнай славы, экскурсіі ў Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, «Хатынь», Брэсцкую крэпасць-герой, лекторыі, тэматычныя вечары, паходы па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы.**

Неад'емнай умовай фарміравання ўсебакова развітой асобы з'яўляецца маральна-эстэтычнае выхаванне. Ва універсітэце вялікая ўвага аддаецца развіццю мастацкай самадзейнасці як адной з форм маральна-эстэтычнага выхавання. Асаблівасць мастацкай самадзейнасці універсітэта — гэта яе масавасць і высокі прафесіяналізм. У самадзейнасці ў нас практычна ўдзельнічае кожны трэці студэнт. Чатыром агульнауніверсітэцкім калектывам мастацкай самадзейнасці прысвоена ганаровае званне народнага.

**АДНОЙ з форм эфектыўнай выхаваўчай работы ва універсітэце служыць грамадска-палітычная практыка студэнтаў. Яна аб'ядноўвае атрыманыя веды студэнтаў па марксісцка-ленінскай тэорыі з практычнымі справамі, палітычнай, арганізацыйна-масавай работай сярод насельніцтва, фарміруе ў студэнтаў навыкі арганізатараў і выхавацеляў.**

Грамадска-палітычная практыка непасрэдна спалучаецца з працоўным выхаваннем, якое праяўляецца ў самых розных формах. Гэта — авалоданне асновамі сучаснай навукі ў ходзе навучання, работа ў студэнцкіх навукова-даследчых бюро, удзел у грамадскім жыцці, праца на прадпрыемствах, будоўлях, у калгасах і саўгасах. Яскравым сведчаннем зліцця працоўнага і палітычнага выхавання з'яўляюцца студэнцкія будаўнічыя атрады. Толькі ў гэтым годзе ў Беларусі і на БАМе, у Карэліі і раёнах Нечарназем'я, Малдавіі працавала 89 студэнцкіх будаўнічых атрадаў.

**Разнастайныя ва універсітэце і формы інтэрнацыянальнага выхавання студэнцкай моладзі. У цяперашні час у нас займаецца каля 700 замежных студэнтаў, аспірантаў і стажораў з 65 краін свету. А гэта абумоўлівае паўсядзённую карпатлівую работу па прапагандзе нашага сацыялістычнага ладу жыцця, ідэалаў камунізму.**

Прафком універсітэта сумесна з камітэтам камсамола і студгарадком у справаздачным перыядзе праводзіў агляд-конкурс на лепшы студэнцкі інтэрнат універсітэта па арганізацыі ўмоў працы, быту і адпачынку студэнтаў. У гэтым годзе агляд-конкурс прысвечаны 110-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна.

У плане жыллёва-бытавой работы прафкомам, прафбюро факультэтаў не ўпускаюцца і такія пытанні, як выхаванне ў студэнтаў пачуцця беражлівых адносін да сацыялістычнай уласнасці, правядзенне суботнікаў і нядзельнікаў па навядзенню парадку ў студэнцкіх інтэрнатах, праверка жыллёва-бытавых умоў студэнтаў, якія жывуць на прыватных кватэрах.

Нямала скарг мы яшчэ атрымліваем ад студэнтаў па прычыне няправільнага размеркавання месц у інтэрнаце. Гэта гаворыць аб тым, што і тут прафсаюзныя арганізацыі факультэтаў вядуць слабую работу. **У цяперашні час універсітэт мае 8 інтэрнатаў на 5,5 тысячы месц. З іх больш дзвюх тысяч займаюць замежныя студэнты, аспіранты, слухачы факультэтаў павышэння кваліфікацыі, сем'і супрацоўнікаў. Практычна савецкім студэнтам застаецца толькі 3 тысячы месц. Засяленне звыш санітарных норм дазваляе павялічыць колькасць пражываючых да 5 тысяч чалавек. Маюць жа патрэбу ў інтэрнаце 7,5 тысячы чалавек. Таму новаму саставу прафкома патрэбна востра ставіць перад рэктаратам пытанне аб будаўніцтве студэнцкіх інтэрнатаў, у тым ліку аднаго інтэрната для сямейных студэнтаў.**

Важным участкам прафсаюзнай работы з'яўляецца развіццё фізкультуры і спорту—галоўнага фактара ўмацавання здароўя, павышэння працаздольнасці, найбольш эфектыўнай формы актыўнага адпачынку.

Ва універсітэце штогод праводзіцца агляд-конкурс на лепшую арганізацыю масавай спартыўнай работы на факультэтах, які ўключае ў сябе, акрамя ўдзелу ў спартакіядзе, і арганізацыю масавай спартыўнай работы на факультэце, і падрыхтоўку спартсменаў-разраднікаў, работу па комплексу ГПА.

**Вялікай папулярнасцю сярод студэнтаў універсітэта карыстаецца турызм. Толькі за 1978 год было праведзена 256 аднадзённых турысцкіх паходаў, у якіх прыняло ўдзел больш як 5 тысяч чалавек, і 61 шматдзённы паход па розных раёнах Беларусі і Савецкага Саюза. У іх удзельнічаў 541 студэнт. Турысцкі клуб універсітэта вырашае шэраг пытанняў, звязаных з вучэбна-трэніровачнай работай, прыёмам норм комплексу ГПА па турызму, распрацоўвае маршруты шматдзённых і аднадзённых паходаў. Стала традыцыяй правядзенне ў дні зімовых канікулаў зорных паходаў па месцах баявой і працоўнай славы савецкага народа, у якіх штогод прымаюць удзел да 100 чалавек.**



Асаблівую ўвагу прафсаюзны камітэт удзяляе арганізацыі адпачынку студэнтаў у перыяд летніх канікулаў. Асноўная маса студэнтаў адпачывае ў аздараўленча-спартыўным лагеры «Нарач». За 1978-79 гады лагер гасцінна прыняў 2250 савецкіх і замежных студэнтаў. Трэба адзначыць, што за апошнія пяць гадоў лагер узрос не толькі колькасна, але таксама значна ўдасканаліў формы выхаваўчай і спартыўнай работы, умацавалася і матэрыяльная база. У гэтым годзе замест палатак узведзены 4 будынкі на 65 месц. Па выніках Усесаюзнага агляду работы універсітэцкі лагер заняў II месца. Прафком універсітэта пастаянна арганізуе абмен пуцёўкамі ў аздараўленча-спартыўныя лагеры іншых ВНУ краіны: Калінінградскага, Ерэванскага, Маскоўскага, Кішынёўскага універсітэтаў.

ВАЖНАЕ месца ў рабоце прафсаюзнага камітэта займалі пытанні арганізацыі грамадскага харчавання студэнтаў. За справаздачны перыяд грамадскае харчаванне ва універсітэце некалькі палепшылася. **Так, у 1977 годзе ўведзены ў строй новая сталовая на 300 месц па вуліцы Кастрычніцкай, а таксама сталовая па вуліцы Маскоўскай, у корпусе факультэта журналістыкі на 150 месц. Трэба адзначыць, што гэтыя сталовыя аснашчаны самым сучасным абсталяваннем, у тым ліку ліній «Эфект», што дазваляе павялічыць прапускную здольнасць. У цяперашні час універсітэт мае 9 сталовых на 1466 месц і 8 буфетаў на 256 месц. Але і гэтай колькасці месц недастаткова для арганізацыі нармальнага харчавання студэнтаў.**

Прафком не выкарыстаў свае магчымасці ў арганізацыі грамадскага харчавання. Такія важныя рашэнні прэзідыума прафкома, як арганізацыя льготнага харчавання студэнтаў, харчавання па абанементах, да цяперашняга часу не рэалізаваны. Дрэнна вывучаны і перадавы вопыт у арганізацыі грамадскага харчавання.

Час патрабуе ад нас далейшага ўдасканалення форм і метадаў работы, далейшага ўкаранення ленінскага стылю ў дзейнасць прафсаюзных груп, прафбюро і прафкома. Прафсаюзны камітэт ускладае надзею на ўноў выбраны актыў, што ён справіцца з адказнымі задачамі, дастойна сустрэне 110-ю гадавіну з дня нараджэння У. І. Леніна і 60-годдзе нашага універсітэта.

**На здымках:** рэгістрацыя дэлегатаў; пастанова прымаецца аднагалосна; у час перапынку.

Фота **М. Дубовіка.**

● КАМСАМОЛЬСКІ ПРАЖЭКТАР

# ПРАБЛЕМЫ РОСТУ

«Камсамольскі пражэктар» — гэта масавая форма ўдзелу моладзі ў грамадскім кантролі, важны сродак у рабоце камсамола па камуністычнаму выхаванню маладога пакалення. Галоўная задача «КП» — развіваць у людзей актыўнасць, прынцыповасць, непрымірымасць да недахопаў, пачуццё асабістай адказнасці за справы калектыву.

Як жа наладжана работа ў «пражэктарыстаў» універсітэта?

Сёння наша жыццё асвятляюць 12 штабаў «КП». Штогод праводзіцца звыш 500 рэйдаўправерак, якія знаходзяць сваё адлюстраванне ў спецвыпусках «КП», «маланках», «баявых лістках». Усё больш рэалізуюцца асноўныя прынцыпы «Камсамольскага пражэктара» —масавасць, галоснасць. Каля 80 актыўных камсамольцаў пастаянна працуюць у штабах «КП», расце колькасць пастоў. Іменна таму на нядаўна прайшоўшым аглядзе сродкаў галоснасці груп народнага кантролю і «КП» Маскоўскага раёна горада універсітэцкія ГНК і «Камсамольскі пражэктар» былі ў ліку пераможцаў. Вопыт работы набыты, але час ідзе наперад. І тое, што ўчора задавальняла нас, сёння ўжо не будзе адпавядаць галоўнай задачы дня.

Можна выдзеліць некалькі напрамкаў, па якіх павінна весціся работа штаба «Камсамольскага пражэктара». Папершае, «пражэктарысты» часта ўскрываюць недахопы, ставяць праблемы. Асабліва вялікія зрухі ў плане акадэмічнай работы. Гэта тлумачыцца тым, што вучэбнай часткай пастаянна займаюцца дэканат, ВВК, камітэт камсамола і іншыя. Хочацца адзначыць станоўчы вопыт сумесных дзеянняў штаба «Камсамольскага пражэктара» і ВВК факультэта радыёфізікі і электронікі (старшыня штаба В. Шэйчанка). Аднак, узняўшы праблему, «пражэктарысты» амаль усіх факультэтаў не робяць грунтоўнага аналізу таго ці іншага недахопу. Атрымліваецца простая канстатацыя фактаў.

Першы напрамак у рабоце поўнасцю мяжуе з другім. Гэта — рэалізацыя матэрыялаў рэйдаў-праверак. Пэўныя зрухі відаць пакуль толькі на журфаку і філфаку, дзе рэгулярна ў нумарах «КП» вядзецца рубрыка «Па слядах нашых выступленняў». Вырашыць праблему да канца можна толькі тады, калі будзе самы цесны кантакт з групай народнага кантролю, другімі арганізацыямі. Вынікі праверак лепш за ўсё разглядаць на сумесных пасяджэннях, дзе выпрацоўваюцца прапановы і рэкамендацыі па ўхіленню выяўленых недахопаў, арганізуецца кантроль за іх ажыццяўленнем. Усё гэта значна павысіць ролю і аўтарытэт «Камсамольскага пражэктара». Арганізацыйным жа пачаткам у сумеснай рабоце будзе каардынацыя перспектыўных і бягучых планаў ГНК і «КП».

Далей, ці не лепш было б кожнаму штабу намеціць на год работы 3—4 комплексныя праблемы, а не хапацца за ўсё разам. Тады і вынікі будуць відавочныя. Так, напрыклад, «КП» хімфака (старшыня В. Мальцаў) грунтоўна вырашыў праблему работы сталовай хімічнага корпуса. Такія прыклады не адзінкавыя, хаця замацаваць іх у аснове ўсёй работы — наша задача. Неабходна таксама больш увагі ўдзяляць быту студэнтаў у інтэрнаце, зберажэнню сацыялістычнай маёмасці і г. д.

Нявырашаным застаецца пакуль што пытанне з замацаваннем кадраў. Здараецца, што старшыні штабаў мяняюцца кожны год, а адпаведна — і адказныя за сектары. Сёлета, дарэчы, на шасці факультэтах зноў адбыліся перавыбары штабаў. Неабходна загадзя рыхтаваць да гэтай работы больш актыўных камсамольцаў, шырэй прыцягваць тых, хто ўжо мае вопыт работы. У сувязі з гэтым больш увагі павінна ўдзяляцца вучобе «пражэктарыстаў».

Камітэтам камсамола і штабам «КП» універсітэта падрыхтаваны метадычны матэрыял па кіраўніцтву работай штабаў і пастоў «КП». Гэта — і памятка па арганізацыі рэйдаў-праверак, і прыклады вядзення дакументацыі, і планаванне вучобы актывістаў і г. д. Усё гэта надасць рабоце «Камсамольскага пражэктара» больш планамерны і мэтанакіраваны характар.

**Г. ІЛЬЯШЧУК,**
**В. ЧАРНУШЭНКА.**

# НАСУСТРАЧ КОНКУРСУ

З кожным годам расце навуковы патэнцыял вышэйшай школы і яе ўклад у навукова-тэхнічны прагрэс краіны. Вялікае значэнне для далейшага развіцця навукі ў вышэйшай школе маюць пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ад 6 красавіка 1978 года № 271 «Аб павышэнні эфектыўнасці навукова-даследчай работы ў вышэйшых навучальных установах» і пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб далейшым развіцці вышэйшай школы і павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў».

Адным з мерапрыемстваў, якія прадугледжаны пастановай ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ад 6 красавіка 1978 года і накіраваных на павышэнне эфектыўнасці навукі ВНУ, з'яўляецца арганізацыя конкурсаў на лепшыя навукова-даследчыя работы, выкананыя ў вышэйшых навуковых установах краіны.

Для заахвочвання аўтараў лепшых навукова-даследчых работ, прадстаўленых на конкурсы, устаноўлена 10 першых прэмій па 2000 рублёў, да 20 другіх прэмій па 1000 рублёў і да 50 трэціх прэмій па 500 рублёў кожная.

Першы конкурс, як гэта аб'яўлена сумесным загадам-пастановай Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і прэзідыума ЦК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў ад 22 студзеня 1979 года № 88, будзе праводзіцца ў 1980 годзе па 28 раздзелах навукі і тэхнікі.

На конкурс прадстаўляюцца навукова-даследчыя работы па актуальных праблемах грамадскіх, прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навук, якія маюць вялікае народнагаспадарчае, навуковае і сацыяльна - эканамічнае значэнне і завершаны на працягу 1978 і 1979 гадоў.

Аўтарамі прадстаўляемых на конкурс работ могуць быць прафесары, выкладчыкі, вучэбна-дапаможны персанал, навуковыя супрацоўнікі, аспіранты, студэнты-сааўтары.

Таму ўжо ў цяперашні час кожная кафедра і кожная навуковая ўстанова ВНУ павінны прааналізаваць вынікі сваёй навуковай работы, адабраць лепшыя з іх і пры падтрымцы саветаў факультэтаў і ВНУ накіраваць іх у адпаведнае міністэрства ці ведамства да 1 студзеня 1980 года.

Работы, прадстаўляемыя на конкурс, могуць быць індывідуальнымі і калектыўнымі. Састаў аўтараў калектыўнай работы не павінен перавышаць 12 чалавек.

Навукова-даследчыя работы трэба прадстаўляць у выглядзе манаграфій ці навуковых справаздач, аформленых у адпаведнасці з ГОСТам 19600-74. Лаўрэатам конкурсу разам з прэміяй уручаюцца дыпломы і нагрудныя медалі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і прэзідыума ЦК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў.

Конкурс на лепшыя навуковыя работы з'явіцца аглядам эфектыўнасці даследаванняў, якія выкананы ў ВНУ краіны. Ён будзе садзейнічаць актывізацыі навукова-даследчай дзейнасці прафесараў, выкладчыкаў, навуковых супрацоўнікаў і студэнтаў.

Справа гонару кожнай ВНУ —прыняць удзел у гэтым конкурсе.

**В. КРУТАЎ,**
**старшыня навукова-тэхнічнага савета Мінвуза СССР, старшыня экспертнай камісіі конкурсу на лепшыя навукова-даследчыя работы 1980 года.**

МАРШРУТЫ «КРЫЖАЧКА»

# З вялікім поспехам

Народны ансамбль народнага танца «Крыжачок». Яго ведаюць многія. І не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Польшча, Балгарыя, Аўстрыя, Ангола, ГДР — вось няпоўны пералік тых краін, дзе даводзілася выступаць ансамблю.



Але куды б ні паехалі, усюды нас чакалі з нецярплівасцю. Вось і цяпер, у Аўстраліі і Новай Зеландыі. У мінулым месяцы ў Аўстраліі па шырокай праграме праходзіў фестываль савецкай культуры. На ім адным з прадстаўнікоў нашай краіны і быў ансамбль «Крыжачок», у састаў якога ўваходзілі: І. Млынчык — выкладчык факультэта прыкладной матэматыкі, М. Кораб — выпускнік геаграфічнага факультэта, студэнткі II курса матэматычнага факультэта Л. Пугачова, Т. Лемеш і іншыя.



50 тысяч кіламетраў самалётам. Нават цяжка сабе ўявіць. Гэта больш, чым калі абляцець вакол экватара. Былі і такія выпадкі, калі пералёты праходзілі дрэнна, кідала, самалёт нібы кудысьці правальваўся. Але часу на адпачынак не было. Як кажуць, «з карабля на баль», або, дакладней, — з самалёта на сцэну.

Рабяты выступалі ў Сіднеі, Канберы, Мельбурне, Адэлаідзе, Перце, Брысбене, Крайсчэрчы, Рэлінгтоне, Ратаруа, Оклендзе і іншых гарадах Аўстраліі і Новай Зеландыі. Усяго было 18 канцэртаў, на якіх прысутнічала больш як 16,5 тысячы чалавек.

Амаль кожны раз слава апярэджвала прыбыццё ансамбля, і таму сустрэчы праходзілі заўсёды ў цёплых абставінах, залы былі перапоўнены. І не было такога танца, які б потым не выклікалі на біс.

Але ў гэтыя дні праходзілі не толькі канцэрты. Шмат іншых мерапрыемстваў было прысвечана СССР. У асноўных цэнтрах культуры Аўстраліі прайшлі сустрэчы з савецкімі прадстаўнікамі, сходы, прыёмы, выстаўкі, дыспуты.

Цэнтральным мерапрыемствам з'явіўся прыём у Сіднейскім оперным тэатры, які быў прысвечаны адкрыццю фестываля.

А потым выступленні па радыё і тэлебачанню, сустрэчы па прапагандзе савецкай рэчаіснасці, дасягненняў у развіцці эканомікі і культуры.

Усё гэта паказала вялікую цікавасць аўстралійцаў да савецкай рэчаіснасці і дасягненняў СССР ва ўсіх галінах гаспадаркі, навукі і культуры, імкненне да сяброўства і ўзаемаразумення. Вось чаму большая частка насельніцтва гэтай краіны прымала ўдзел у днях савецкай культуры.

Зразумела і тое, што фестывальныя мерапрыемствы садзейнічалі ажыўленню работы таварыства «Аўстралія—СССР» у цэлым і яго аддзяленнях на месцах, асабліва ў прыцягненні ў яго новых членаў.

Пасольствы Аўстраліі і Новай Зеландыі выказалі падзяку ЦК КПБ і Савету Міністраў БССР, Міністэрству культуры БССР, Мінвузу БССР за накіраванне прадстаўнічай дэлегацыі, высокакваліфікаванай мастацкай групы ансамбля «Крыжачок», што дало магчымасць правесці дні Савецкага Саюза на высокім узроўні.

**М. ЛАПША,**
**мастацкі кіраўнік ансамбля «Крыжачок».**



# Ружовы ранак

*літаратурная старонка*



# Каля купалаўскага вогнішча

Кожны навуковы студэнцкі гурток распачынае працу па-свойму. Што да гуртка гісторыі і тэорыі беларускай літаратуры філалагічнага факультэта, якому сёлета спаўняецца дзесяць гадоў, то кожны год яго першае пасяджэнне традыцыйна бывае выязным і праходзіць у Вязынцы.

Сёлетняя кастрычніцкая Вязынка сустрэла нас золатам лістападу і зыркасцю сонца, водарам яблык з купалаўскага саду і задуменнасцю вербаў над купалаўскім азярцом. Сустрэла шырока расчыненымі — для чулых сэрцаў, роднасных душ — дзвярыма ў Купалаву хату.

Пакланіліся нізка Купалу, адлітаму ў бронзе, усклалі кветкі да помніка. Суцішыліся ў сялянскай хаціне, перад калыскай, якая памятае прыход у гэты свет, якраз у купалаўскую ноч, Яся Луцэвіча — будучага Янкі Купалы. Пахадзілі па садзе, пастаялі каля азярка, прычасціліся з гаючай Купалавай крыніцы... А затым рушылі да недалёкага ляснога ўзгорка, каб раскласці там — зноўтакі традыцыйнае ўжо — купалаўскае вогнішча. Купалаўскае таму, што ў ім не толькі добра пячэцца «паэтычная» вязынкаўская бульба і смажыцца на драўляных прутах не менш «паэтычнае» студэнцкае сала, але і таму, што ледзь яго раскладзеш — як тут жа начынаюць гучаць вершы і песні.

На гэты раз купалаўскае вогнішча чула паэтычныя радкі не адных універсітэцкіх паэтаў (дарэчы, хоць наш гурток навуковы, амаль усе яго члены не «чыстыя» літаратуразнаўцы, а яшчэ па сумяшчэнню і паэты). Да нас ахвотна далучыліся філолагі Мінскага педінстытута, члены літаратурнага аб'яднання «Крокі» — першакурснікі С. Грузневіч і М. Малашэвіч, другакурснікі М. Ждановіч, Л. Харужык, В. Рамадзін, М. Мікуліч і нават «сам» М. Шабовіч — старшыня аб'яднання, студэнт трэцяга курса. Вось так, уперамежку, і чыталі свае вершы — яны, сябры з педінстытута, і нашы гуртко́ўцы М. Шаляговіч, С. Сокалаў, І. Сабачэўская, А. Якубчык, М. Студэнт... Думаю, чытачы «Беларускага універсітэта» з прыемнасцю далучацца зараз да слухачоў купалаўскага вогнішча, каб зацікаўлена паслухаць маладых паэтаў — і сваіх, універсітэцкіх, і педінстытуцкіх...

Пасля, калі паэтычнае полымя крыху ўлеглася, калі з вогнішча выкаціліся духмяная бульба і на яе, злёгку пасоленую, закапаў разагрэты тлушч, пайшла гутарка пра задачы і мэты гуртка беларускай літаратуры, пра яго планы на бягучы навучальны год. А ў планах—напісанне навуковых прац і запіс успамінаў вядомых літаратараў — выхаванцаў універсітэта, і паездкі па мясцінах, звязаных з жыццём і творчай дзейнасцю Янкі Купалы і Якуба Коласа, і сістэматычнае наведванне музеяў, выставак, літаратурных вечароў, і ўдзел у студэнцкіх навуковых канферэнцыях... Планы багатыя, цікавыя. Толькі б хапіла маладога запалу іх выканаць.

Уласна, дзеля гэтага і запальвалася купалаўскае вогнішча, якое — хочацца ў гэта верыць — будзе доўга свяціць маладым навукоўцам.

**В. РАГОЙША,**
**дацэнт кафедры беларускай літаратуры, кіраўнік гуртка.**

**М. ШАЛЯГОВІЧ**

## Краявід

Рабіў прыроды я агляд
І бачыў: на лугоў раздолле
Схіліў свой цяжар далягляд
Аблокаў зменліва-павольных.
А лес, уткнёны ў поля край,
Шумеў ухабістай спіною.
І абяцаў для думак рай
І прычашчэнне — чысцінёй.

## Мая багіня

Лауру ў санетах уславіў
Пятрарка...
Паліне Тургенеў жыццё
прысвяціў...
Марылю Міцкевіч назваў
«свіцязянкай»...
Элізу Бетховен у сэрцы насіў...
Не трэба мець вочы
і розум паэта:
У кожнай жанчыне
багіня жыве,
Хай толькі спаткае цябе
Афрадзіта —
Услед за сабой у палон
павядзе.

А я прысвячаю радкі той
адзінай,
Якую сваёй мілавіцай
назваў,
Чый вобраз натхняе
і сумнай хвілінай,
З якою чароўнасці свету
спазнаў.
І хай мне вар'яцкую смеласць
даруюць:
Каханую ў шэраг узвёў я
багінь.
Упэўнены, з ёю яны
пасябруюць.
Бо шлях на нябёсы для ўсіх
быў адзін.

**М. ЖДАНОВІЧ**

## Сустрэчны

Са свістам пранёсся
сустрэчны...
Маланкаю з яснага неба.
Сустрэчны пранёсся
з канечнай,
Дзе быць мне сёння трэба...
Дзе горад, бы сябра
лепшы.
Абдыме шумам вакзальным...
Каго паімчаў, сустрэчны,
Мне сэрца кранууўшы
жалем?..
Ён нібы пачуў здалёку —
Гудок страсянуў наваколле...
— Вязу я ўсяго патроху,
Ды шчасця ўсё-такі болей...
Хай так.
І ўсё сумую,
Гатоў да зямногі — следам:
А можа павёз ён тую,
Да якой я
жыццё ўсё еду...

## Аўтобус у дзяцінства

Жыццё мяняе несупынна
У душы трывогу, радасць,
злосць...
Стаю на сонечным прыпынку
З прыгожай назвай
«Маладосць».
А побач з гулам пралятаюць
Падзеі,
людзі,
гарады...
Зноў галасую.
Зноў пытаю.
І зноўку едуць не туды...
А навакол —
жыцця адзінства...
Мне ціхі смутак студзіць
кроў:
Аўтобус у маё дзяцінства
Ужо надоечы прайшоў...

**І. САБАЧЭЎСКАЯ**

## Дзяўчына ў белым

Галінкай чаромхі,
Прывабнай, нясмелай,
Стаіць на парозе
Дзяўчына ў белым.
Апошнія гукі
Чароўнага вальса.
Любімая школа,
Ты з ёй развітайся.
Дарогі, дарогі
Паклікалі смела.
Стаіць на парозе
Дзяўчына ў белым.



x x x

Прыязджаю з дарог да хаты,
Прыязджаю з дарог да мамы,
Пад ваконцам бушуе мята,
На стале хлеб смачнейшы
самы.
Мяне зноў не пазналі
суседкі,
Засумую на міг
і ўсміхнуся.
А матуля пакліча:
«Дзеткі!» —
Вось вазьму і ў
дзяцінства вярнуся.
Едзе восень да жніўня
ў сваты,
Ці май месяц прыходзіць
жаданы,
Прыязджаю з дарог да хаты,
Прыязджаю з дарог да мамы.

**С. СОКАЛАЎ**

## На спатканне з тэатрам

Горад.
Горы звярнуць гатоў
Натоўп.
Хрыбет ад чакання скрывеў
у чаргі
Зранку,
І мэта, як сэнс існавання,—
Білет
На Таганку,
Дзе цесна спляліся Высоцкі
і Гамлет
І дыхае ў сэрцы акцёраў
Ажыўшы Булгакаў...
— Ну што там?
— Ну як там?
— Здаецца надзеі ніякай...
А сонца пячэ.
— Хоць надвор'е б наладзіла,
Вось абыкавасць!..
І раптам прыцiхла,
Нібы насцярожаны зал,
Вялікае сэрца чаргі,
Нібы цела вужа.
І першага выдых,
Як вокліч, прабег да канца:
— Дастаў!..
І надзеі няма ў «хваста».
І кожны амаль, не пабачыўшы,
ведае
Ап-ты-містычную трагедыю...
Уночы,
Калі адспявалі ўсе калыханкі,
Да цішыні прыкладваю вуха
І слухаю, слухаю, слухаю
Горада сон:
Залатухін...
І дзесяць дзён,
«Што патрэслі свет»...
І Ранінсон...
Сон, сон...
А зранку
Абудзіць адзінае слова:
Таганка.

**М. ШАБОВІЧ**



## Маладосць

Дзяўчына ў кароткай сукенцы
Ідзе з навальніцай на стрэчу.
Ей бы схавацца ў сенцы
Ад дажджавой халадэчы.
Быццам бы пад навесам
Ці пад накідкай горай?
Яна ж, як тая прынцэса,
Яшчэ й галаву ўгору.
Ножкамі лёгка ступае,
Нібы Венера Мілоская.
Яна Маладосць вітае,
Яна сама з Маладосці.

## Немаўля

Маленечкае дрэўца —
немаўлятка
Як птушаня пужлівае,
Яно
Хістаецца і хіліцца да маткі,
А ў маткі той дзіцятка
не адно.
Іх тут навокал цэлая чародка,
І зараз — тройня дрэўцаў —
немаўлят.
Ім холадна ад ветру,
ім дрыготка,
Для іх нямілы чэрвеньскі
пагляд.
А маці шчодра падстаўляе
грудзі.
І разам з ёй трапечацца
зямля...
А што, калі па лесе
пройдуць людзі,
Жывым ці застанецца
немаўля?


**Беларускі універсітэт**

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ

15 лістапада 1979 г.
Заказ № 1834. АТ 10926

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.
ТЭЛЕФОН 22-07-19

В. а. рэдактара
В. П. ВАРАБ'ЁЎ